# Ваенныя песні пад мірным небам.



Ілона Пацук не першы раз прымае ўдзел у фестывалі патрыятычнай песні, які штогод праходзіць у раённым Доме культуры. “Баллада матери” у яе выкананні кранула не толькі сэрцы слухачоў, але і журы. Разам з Ілонай у гэты дзень яшчэ 34 удзельнікі з усяго раёна прадставілі багаты рэпертуар твораў, якія выклікаюць глыбокія пачуцці, акунаюць у тыя далёкія часы, калі наш народ мужна адстойваў незалежнасць роднай зямлі.



Трапіўшы ў залу РДК, я не адразу зразумела, у чым справа. Здаецца, на вуліцы мірны час, а на сцэне – людзі ў гімнасцёрках. Ваенныя песні, якія яны выконваюць, кранаюць да глыбіні душы… На момант падалося, што я вярнулася ў мінулае. Хацелася ляцець разам з “Жураўлямі”, заклінаць: “Ты толькі чакай”, адчуваць сябе “Новым пакаленнем” і любавацца “Беларуссю сінявокай”. Песні пра ваеннае ліхалецце, пра каханне і любоў да Радзімы – іх так многа, яны такія запамінальныя...



Адны музычныя творы дапаўняліся слайдамі, другія – танцавальнымі нумарамі. Усіх артыстаў горача падтрымлівалі гледачы: шчырымі апладысментамі быў адораны кожны ўдзельнік фестывалю.

Пераможцы вызначаліся ў чатырох намінацыях. Сярод выканаўцаў ад 14 да 19 год

першае месца раздзялілі Ілона Пацук са Шчучынскага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі і Анастасія Тракала з СШ №1. Пераможцамі-салістамі ў групе ад 20 да 31 года сталі Галіна Будзько з раённага Дома культуры і Віялета Дукі з Жалудоцкага ГДК. У трэцяй намінацыі сярод дуэтаў, трыо і вакальных груп лепшымі прызнаны квартэты “Апрель” Шчучынскага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі і “Музыкальная капель” СШ №1. Працоўная моладзь парадавала слухачоў музычнымі творамі пад гітару. У намінацыі “Аўтарская песня” перамаглі Юлія Жынко з гімназіі г.Шчучына і Андрэй Іголкін са Шчучынскага РАНС.

Усе пераможцы конкурсу былі ўзнагароджаны граматамі і каштоўнымі падарункамі.

Арганізатарамі фестывалю выступілі аддзел па справах моладзі Шчучынскага райвыканкама, РДК, РК БРСМ і ДТСААФ.

– Фестываль патрыятычнай песні стаў традыцыйным для нашага раёна, – гаворыць старшыня журы, начальнік аддзела па справах моладзі Таццяна Ганчарук. – Усе ўдзельнікі прадэманстравалі высокі ўзровень падрыхтоўкі. Прыемна, што наша моладзь не толькі добра ведае і любіць патрыятычныя песні старэйшага пакалення, але ўносіць і свой уклад у працяг лепшых традыцый.